ДЗЕНЬ ІНАВАЦЫЙ
У ДЗЯРЖАЎНАЙ УСТАНОВЕ АДУКАЦЫІ «ЯСЛІ-САД № 13
г. МАГІЛЁВА»

**18 сакавіка 2019 года** ў дзяржаўнай установе адукацыі **“Яслі-сад № 13 г. Магілёва”** быў праведзены Дзень інавацый у рамках ІІІ Метадычнага фестываля “Інавацыі ў адукацыі Магілёўскай вобласці”, які можна лічыць своеасаблівай творчай справаздачай па выніках інавацыйнай дзейнасці педагагічнага калектыва.

Мэтай мерапрыемства стала прэзентацыя вопыту работы педагогаў установы дошкольнай адукацыі па рэалізацыі інавацыйнага праекта “Укараненне мадэлі арганізацыі працэсу патрыятычнага выхавання дзяцей дашкольнага ўзросту ва ўстанове дашкольнай адукацыі“.

Праграма мерапрыемства была насычаная і разнастайная, аб’яднаная адной тэмай “Беларускія традыцыі”. Увесь калектыў, выхаванцы і госці ў гэты дзень размаўлялі на беларускай мове, бо менавіта родная мова – гэта сродак передачы культуры, традыцый, нацыянальных асаблівасцей, самабытнасці беларускага народа.

Педагогі і выхаванцы ветліва сустракалі гасцей з горада Магілёва і Магілёўскай вобласці ў дашкольнай установе адукацыі, святочна ўпрыгожанай сінявокімі васількамі, абрусамі і ручнікамі.





Загадчык дашкольнай установы **Музычэнка Л.Г.** расказала пра напрацоўкі з вопыту работы калектыву, аб апрабіраваных эфектыўных метадах і формах арганізацыі працэсу патрыятычнага выхавання. Увазе гасцей была прадстаўлена выстава дыдактычных і метадычных матэрыялаў з вопыту работы педагогаў (намеснік загадчыка па асноўнай дзенасці **Быкава І.У.**), майстар-клас па вырабу лялек-берагінь (выхавацель дашкольнай адукацыі **Базуценка І.М.**), гульнявы комплекс “Гульні беларускія” (кіраўнік фізічнага выхавання **Такмянінава В.І.**), інтэграваны занятнак у старэйшай групе “Беларускія майстры” (выхавацель дашкольнай адукацыі **Гусакова Т.П.**).



Кіраўнік фізічнага выхавання Такмянінава В.І. і выхавацелі дашкольнай адукацыі **Дунчанка Г.Л.** і **Лашкевіч Л.С.** прадэманстравалі, як можна творча ўзаемадзейнічаць у пытаннях далучэння дзяцей да роднай мовы і культуры беларускага народа.





На інтаграваным занятку “Беларускія майстры” гаспадыня мастацкай студыі **Гусакова Т.П.**, дзеці і дарослыя ператварыліся ў ганчароў: сляпілі і размалявалі посуд.





Аб асаблівасцях беларускай народнай кухні госці даведаліся на свяце-забаве “Стравы беларускія”, дзе граў гармонік, вялася размова аб нашай культуры, аб нашых продках і нашых нашчадках.



Педагагічны калектыў ДУА “Яслі-сад № 13 г. Магілёва” упэўнены, што так і павінны захоўвацца і перадавацца традыцыі беларускага народа, яго родная матчына мова.